**Шупляк С.П.**

# Узнікненне і развіццё традыцый паломніцтва на ўсходнеславянскіх землях у сярэдніх вяках.

*Беларускі гістарычны часопіс, 2005, №7 с.25-30.*

Сярэдневяковы чалавек, чые успрыяцце свету, паводзіны, менталітэт абумоўліваліся ў першую чаргу царквой і Святым Пісаннем, увесь час цікавіўся рэгіёнам Усходняга Міжземнамор’я, менавіта ў той яго частцы, дзе ўзнікла хрысціянская вера і культура. Традыцыя паломніцтва да святых месцаў Візантыі, Малой Азіі, Палесціны і Егіпта ўзніклі ў хрысціянскім свеце каля IV стагоддзя, калі ананімны паломнік з французскага горада Бардо вярнуўся з Іерусаліма і Палесціны і пакінуў аб гэтым свае запісы.

Паломніцтва у той час было асобным псіхалагічным і рэлігіёзным актам, які вёў чалавека да ачышчэння ад грахоў. Святая Зямля прыцягвала людзей сваёй біблейскай гісторыяй. Матывы, якія рухалі паломнікамі, былі рознымі. Шмат хто хацеў пабачыць святыню і проста дакрануцца да яе, іншых прыцягваў культ хрысціянскіх герояў і іх магілаў, другія ішлі для дабывання сабе рэліквій-фетышаў, якія, як лічылася, лечаць і выратоўваюць ад злых сілаў. Падарожнічалі таксама з-за набожнай цікавасці да краіны, ў якой адбывалася зямное жыццё Хрыста, шукаючы доказаў ягонай зямной прысутнасці, а таксама з жадання пераканацца у сапраўднасці Святога Пісання.

Умовы жыцця таго часу не асабліва схілялі да такіх далёкіх і небяспечных падарожжаў. Стан дарог, адсутнасць абароны ў далёкіх краінах надавалі паломніцтву асаблівы змест. Сярэдневяковае грамадства і царква разглядалі такія вандраванні як імітаванне жыцця Хрыста і яго апосталаў. Нават смерць падчас падарожжа была жаданай, бо гэта інтэрпрэтавалася, як смерць Ісуса на крыжы.

Традыцыя паломніцтва першапачаткова ўзнікла ў Заходняй Еўропе. У 135 годзе падчас падаўлення рымлянамі паўстання яўрэяў быў разбураны Іерусалім, а на яго месцы ўзведзена пасяленне Элія-Капіталіна.[1] Але ў IV стагоддзі візантыйскі імператар Канстанцін, зрабіўшы хрысціянства афіцыйнай рэлігіяй, аднавіў Святы горад, замяніў назву пасялення і нават пабудаваў на месцах біблейскіх святынь некалькі цэркваў. Пасля ўзнаўлення горадам старой назвы, ён стаў галоўным паломніцкім цэнтрам усяго хрысціянскага свету.

У тым жа IV стагоддзі горад наведаў паломнік з Бардо, а таксама паломніца-жанчына, што было для таго часу з’явай незвычайнай.[2] Паломніца з Іспаніі, якую звалі Сільвія, дайшла да Іерусаліма і пакінула аб гэтым свае ўспаміны. З гэтымі першымі вандроўкамі ў Заходняй Еўропе пачынае ўсталёўвацца традыцыя паломніцтва. З’яўляецца ўсё больш апісанняў паломніцкіх

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вандровак, якія атрымалі назву інтэрнарыяў і ўтрымлівалі часцей за ўсё расказ аб шляху паломніка, а таксама маляўнічае апісанне святых месцаў Палесціны і самаго Іерусаліма.

Цэнтрам пакланення, меўшым для заходніх паломнікаў амаль такую ж каштоўнасць, як і Іерусалім, з'яўляўся таксама і Рым. Грабніцы, катакомбы, велічныя саборы са шматлікімі святымі рэліквіямі, ды і рэзідэнцыя самаго папы, прыцягвалі вернікаў якія ішлі туды з надзеяй на выратаванне ад грахоў. Амаль усе яны заўсёды наведвалі горад, калі ішлі ў Іерусалім, жадаючы такім чынам далучыцца да як мага большай колькасці святых месцаў.

У канцы XI –пачатку XII стагоддзяў адбываюцца першыя паломніцтвы ў Палесціну з усходнеславянскіх земляў і з'яўляюцца першыя пісьмовыя звесткі аб гэтых вандроўках. Значна больш позняе ўзнікненне паломніцтва на сённяшніх беларускіх, рускіх і украінскіх тэрыторыях у параўнанні з Захадам было абумоўлена больш познім часам працэса прыняцця і распаўсюджвання хрысціянства, успрымання і ўсталявання новай рэлігіі. З другога боку, важным фактарам было і тое, што у гэты час адбываліся крыжовыя паходы, у выніку якіх многія святыя месцы былі вызвалены ад захапіўшых іх туркаў-сельджукаў. Гэта, безумоўна, у многім зніжала небяспеку для вандроўнікаў у Палесціну і другія святыя месцы. Яны маглі абапірацца на дапамогу крыжакоў, якія былі значна бліжэй да паломнікаў з пункту гледжання рэлігійнай прыналежнасці.

Самі краіны Усхода, былі вядомы славянам задоўга да хрышчэння Русі, аб чым сведчаць летапісы. У старажытных тэкстах падрабязна апісваецца падарожжа княжны Вольгі у Царград (Канстанцінопаль). Аб падарожжы на Усход упамінае жыціе Феадосія Пячэрскага. Ускосным сведчаннем даўніх сувязей Русі з краінамі Усхода і іншымі краінамі свету з'ўлялася славутае "Пасольства аб веры" князя Ўладзіміра.[3] У былінах знакамітага Кіеўскага (Ўладзіміраўскага) цыкла захаваліся водгукі расказаў аб паломніцтвах у Палесціну, здзейсненых у апошняй чвэрці X – пачатку XI стагоддзя. Прыклад таму – быліна аб Васілю Буслаеве, які адправіўся «ко Христову гробу приложится, во Ердане реке искупитися».[4]

У паломніцтвах ўдзельнічала як знаць, так і простыя людзі. У XII стагоддзі афіцыйныя царкоўныя ўлады не заўсёды ўхвалялі такія далёкія падарожжы (у чым былі падобны да заходняй царквы). Ноўгарадскі епіскап Ніфант у сярэдзіне XII стагоддзя загадваў забараняць паломніцтва, разглядаючы іх як спробу «порозну ходячи ясти и питии», асцерагаючыся такім чынам гаспадарскіх страт.

Толькі некаторыя славянскія вандроўнікі пакінулі запісы аб сваіх падарожжах у далёкія краіны. Найбольш раннім з захаваўшыхся апісанняў славянскіх паломніцтваў на Усход былі успаміны ігумена Даніїла, настаяцеля аднаго з чарнігаўскіх манастыроў, які наведаў Палесціну ў пачатку XII стагоддзя. Яго занатоўкі сталі ўзорам, шмат у чым абазначылі структуру апісання паломніцтваў для наступных вернікаў, якія ў славян атрымалі назву "хаджэнняў".

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вандраваў Даніiл ў складзе групы, у якую ўваходзіла некалькі чалавек – прадстаўнікоў Кіева і Ноўгарада: «Мне худому Бог послухъ есть и святый гробъ господен, и вся дружина, русьтии сынове, приключьишиися тогда в тъ день Новгородци и Кияне…».[5] Час падарожжа Даніiла – адразу пасля заканчэння першага крыжовага паходу – быў вельмі неспакойным. У 1099 годзе крыжаносцы ўтварылі Іерусалімскае каралеўства, абвясціўшы каралем свайго правадыра Бадуэна І.[6] Аднак узброеная барацьба мусульманскага насельніцтва супраць еўрапейцаў не спынялася. Міжвольны сведак гэтай вайны, ігумен Даніiл адзначаў у сваім хаджэнні асобныя яе эпізоды, неаднаразова апісваючы цяжкасці падарожжа па краіне, дзе вядуцца баявыя дзеянні. Так, расказваючы аб Аскалоне (мусульманскім горадзе на ўзбярэжжы Міжземнага мора), ён пісаў, што «выходить оттуду срацины и избивають странныя на путехъ техъ».[7] Менавіта дапамога манахаў з палесцінскага манастыра святога Савы, а таксама пратэкцыя караля Бадуэна дазволілі ігумену наведаць такія землі, куды не змаглі пранікнуць «страха ради поганых» іншыя вандроўнікі. У прыватнасці, ён пабываў у Іерыхоне, Віфлееме, а таксама ў Галілеі і на Ціверыядскім возеры. Уважлівыя адносіны іерусалімскіх уладаў дазваляюць меркаваць аб тым, што Даніiл быў для іх не простым паломнікам, а афіцыйным прадстаўніком усходнеславянскіх земляў.[8] Асаблівай увагі заслугоўвае і тое, што, наведваючы ў далёкіх краінах не толькі праваслаўныя, але і лацінскія манастыры, Даніiл выразна ўсведамляў сваю прыналежнасць да праваслаўя.[9] Успрымаючы сваю вандроўку як агульнаславянскую справу, Даніiл называе сябе рускім ігуменам, лампаду каля Гроба Гасподня вешае ад усей славянскай зямлі, а не толькі ад якога-небудзь княства. Даследчыкі лічаць, што па вяртанню на радзіму ў 1113 г. Даніiл быў прызначаны епіскапам у горадзе Юр'еві на Росі (сёння – Белая Царква), а памер у 1122 г. "Хаджэнне ігумена Даніiла" заставалася адзіным пісьмовым сведчаннем вандроўкі практычна на працягу стагоддзя. Але гэта не азначала, што паломніцтва ў гэты час спыніліся. Проста «хаджэнне ігумена Даніiла» было прызнана ў якасці афіцыйнага паведамлення аб Палесціне, а дзякуючы мастацкай вартасці задавальняла цікавасць чытачоў той эпохі.

Важнай вехай у развіцці паломніцкай літаратуры стала апісанне невядомым аўтарам вандроўкі Ефрасінні Полацкай, якое яна ажыццявіла у 1167 г. Верагодна, што гэта апісанне існавала спачатку ў форме вуснага апавядання, таму што ў творы нічога не гаворыцца аб перанясенні мошчаў святой у Кіеў у 1187 г.[10] Жыціе змяшчае цікавы расказ аб адпраўленні паломнікаў у няблізкі шлях і аб развітанні сваякоў з Ефрасінняй: «Вся же братия горко плакахуся отхода ради госпожа своея, и вся гражане выдоша прводити ея; стари плакаху, яко дшере, рекуще: Увы нам вожу старости нашея, просвещение души нашей, подпоре немощи нашей. Юнии же глаголаху: Камо заходиши, свете оочию нашею! Кто нашу юность укрепит, воздеръжание юности нашея? Не остовляй нас сиры, но в молитвах своих не забывай нас. Она же, целовавши всех, благословивши и, воззревши на небо, рече: Ты, Господи Сердцевиче, ходивый со Авраамом, иди и с нами, рабы Твоими, - с

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Еуфросиниею и с Давыдом и с Еупраксиею! И тако поидоша все, еже сущее с нею».[11]

Апісанне паломніцтва, ў складзе жыція Ефрасінні, па ўмовах гэтага жанру не змяшчае агляду святыняў, ці падрабязнага паведамлення ад імя ўдзельнікаў падарожжа. Увага засяроджана на вобразе святой. Аўтар нібы разлічвае, што тапаграфія Палесціны добра вядома чытачам. У жыціі з цеплынёй і тонкім псіхалагічным назіраннем перададзены пачуцці рэлігійна расчуленай асобы – жанчыны, якая шмат гадоў марыла наведаць вялікія святыні Усходу. Паломніцтва ў Іерусалім нібы завяршае шэраг зямных спраў полацкай князёўны. Яно ацэньваецца аўтарам жыція як заключны і самы значны этап яе жыцця. На працягу твора гераіня нібы толькі набліжаецца да варот іншага свету, імкнучыся ў рай. Кожны з папярэдніх подзвігаў блекне перад наступным, а на апошнім этапе яе прага да выратавання ад грахоў набывае літаральнае значэнне паходу да Святой дамавіны, да смерці цела і перасялення душы ў Іерусалім Нябесны. Замілаванне Богам, вера ў выратаванне чалавека, які цяжка і невылечна хварэе, перададзены ў апісанні ў дынамічнай і вельмі напружанай апавядальнай манеры. Ефрасіння памірае пад час паломніцтва, і дасягае тым самым статуса святой.[12]

Такім чынам два памятнікі ўсходнеславянскай паломніцкай літаратуры "Хаджэнне ігумена Данііла" і "Жыціе Ефрасінні Полацкай" у поўнай меры задавальнялі рэлігійную цікавасць тагачасных вернікаў і адлюстроўвалі духоўны стан іх жыцця. Хаджэнні ў першую чаргу выконвалі ідэнтыфікацыю святых мясцін, пераконвалі ў сапраўднасці Боскіх ісцін і праўдзівасці веры. Важным было і разуменне стану эмацыянальнага жыцця асобы ля Боскай дамавіны. І пакуль умовы духоўнага быцця карэнным чынам не змяніліся, новых помнікаў, звязаных з паломніцтвам, на ўсходнеславянскіх землях не ўзнікала.

Пачынаючы з другой паловы XIII ст. паломніцтва на Усход з усходнеславянскіх земляў наогул прыйшло ў заняпад. У пісьмовых крыніцах таго часу было мала сведчанняў аб падарожжах жыхароў славянскіх земляў. Гэта было абумоўлена як унутранымі праблемамі (татара-мангольскае іга), барацьбой з каталіцкімі ордэнамі крыжаносцаў і тэўтонаў, так і сітуацыяй на самім Усходзе. На працягу некалькі стагоддзяў тут не пераставалі ісці жорсткія сутыкненні паміж крыжаносцамі і туркамі-сельджукамі. Тым не менш сувязі з Палесцінай і Візантыяй не спыняліся.

На мяжы XII – XIII ст. "пальма першынства" ў здзяйсненні найбольш далёкіх вандровак пераходзіць да Ноўгарада. Своеасаблівай крыніцай для ўзнікнення новых сачыненняў падобнага роду стаў тады Канстанцінопаль. Ноўгарадцы, якія ўласнай паломніцкай літаратуры не мелі, а вандравалі шмат, аддавалі асноўную ўвагу апісанню багацця і святыняў гэтага горада.[13]

Ноўгарадскі першы летапіс паведамляе, напрыклад, аб вандроўцы ў Канстанцінопаль, якое было звершана ў 1200 – 1204 гг. Дабрыняй Ядрэйкавічам, знатным ноўгарадцам: "пришол... Добрыня Ядрьковиць изъ Цесаряграда и привезе съ собою гробъ господзенъ (гэта значыць яго параметры), а сам пострижисе на Хутинъ у святого Спаса; и волею Божиею

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

възлюби и князь Мьстисласъ и вси новгородци, и послаша и в Русь ставится; и приде поставленъ архиепископ Антонии…”.[14]

Акрамя Дабрыні Ядрэйкавіча, у XII – XIV ст. на Усходзе пабывалі дзяк Аляксандр, Рыгор Каліка (святар Касмадзем'янскай царквы, а з 1330 г. – архіепіскап Васіль), Стэфан Ноўгарадзец, нейкі ананімны аўтар і інш. Ноўгарад, пазбегнуўшы разбурэння і захопу з боку мангола-татараў, працягваў захоўваць сувязі з іншаземнымі краінамі, у тым ліку і з Візантыяй.

Пілігрымы гэтага перыяду значна адрозніваліся ад сваіх папярэднікаў. Гэта былі ўжо не выпадковыя рэлігійна расчуленыя людзі, што вандравалі стыхійна па ўласнаму жаданню, а у большасці сваёй прадстаўнікі сярэдняга звяна духавенства, якіх накіроўвалі ў хрысціянскія цэнтры царкоўныя ўлады. Пашыраўся кругагляд новых паломнікаў, у сферу якога усе часцей траплялі не толькі рэлігійныя, але і гаспадарчыя, эканамічныя і палітычныя бакі жыцця далёкіх краін.

Адным са значных твораў гэтага перыяду на ўсходнеславянскіх землях з'яўляецца таксама “Хаджэнне архімандрыта Графенія”. Гэта вельмі загадкавы твор. Ні паходжане, ні сапраўднае манаскае імя яго аўтара не паддаюцца на сёняшні дзень бясспрэчнаму вызначэнню. Адзінае, што дакладна высветлена, гэта час напісання твора - 1375 год.

Вандраваў Графеній па Палесціне пераважна адзін, толькі зрэдку ён далучаўся да нейкіх іншых групаў. Разам з паломніцтвам Графеній выконваў яшчэ і нейкую сваю задачу, звязаную з аналізам пабудоў палесцінскіх цэркваў. Гэта і абумовіла змест твора і яго стыль: ні адзін з паломнікаў ні на Усходзе, ні на Захадзе не называў такой колькасці разбураных храмаў. Графеній звяртаў асаблівую ўвагу на тэхнічны і тэхналагічны бок пабудоў, апісваў асаблівасці ўзвядзення даху, муроўкі сцен, пералічваў калоны і слупы. Часам аўтар змяшчаў у сваіх запісах звесткі эканамічнага і сельскагаспадарчага характару.

“Хаджэнне Ігнація Смаляніна ў Царград” – з'яўляецца яшчэ адным з апісанняў паломніцтва, аўтарам якога з'яўляецца выхадзец з беларускіх земляў. Ігнацій быў членам амбасады смаленскага епіскапа і маскоўскага мітрапаліта Пімена. Падарожжа было здзейснена у 1389 – 1393 гг. Чалавек назіральны, Ігнацій падрабязна апісаў мясціны і помнікі культуры, якія траплялііся на яго шляху. Шмат чаго ён паведамляе аб палітычнай сітуацыі ў Візантыі, на Балканах, а таксама ў маскоўскай дзяржаве. Вельмі падрабязна апісаны шлях да Канстанцінопаля, які быў пройдзена па рацэ Дон да Азоўскага мора, а потым па узбярэжжу Чорнага да Візантыі.

Аналіз паломніцкіх твораў паказвае, што гісторыя хаджэнняў на усходнеславянскіх землях мае параўнальна з іншымі жанрамі своеасаблівы характар. Справа не толькі ў тым, што ў творах аднаго аўтара-паломніка спалучаюцца розныя, часам супрацьлеглыя тэндэнцыі і элементы. У той ці іншай ступені гэта ўласціва і летапісу, і пропаведзі, і жыціям. Але летапісны жанр развіваецца бесперапынна. Бесперапынна да часоў свайго заняпаду развіваюцца і агіяграфічныя творы. Што тычыцца апісанняў падарожжаў да святых мясцінаў, галоўнае адрозненне заключаецца у тым, што падарожжы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

праходзілі з даволі вялікімі перапынкамі. Так пасля з'яўлення апісання ігуменам Даніілам гісторыі сваёй вандроўкі назіраецца перапынак амаль на сто гадоў. Толькі у канцы XII – пачатку XIII ст. ствараюцца апісанні паломніцтваў Ефрасінні Полацкай, Дабрыні Ядрэйкавіча. Праз паўтара стагоддзя, у канцы XIV – XV ст. узнікае пяць паломніцкіх твораў вельмі рознага зместу і рознай якасці. Гэта "Хаджэнне архімандрыта Графенія", "Хаджэнне Ігнація Смаляніна", "Апісанне Салуня", зробленнае таксама Смалянінам, "Хаджэнне іераманаха Варсанофія ў Ерусалім" 1456 г. і "Хаджэнне Варсанофія ў Егіпет, на Сінай і ў Палестыну" у 1461 – 1462 г.г. Пасля гэтага - новы перапынак да канца XVI – пачатку XVII ст.

Такія вялікія перапынкі, а таксама параўнальна невялікая колькасць паломнікаў з усходнеславянскіх зямель былі абумоўлены асаблівасцямі іх развіцця у гэты перыяд у параўнанні з Заходняй Еўропай, дзе паломніцтвы ўзніклі і значна больш актыўна развіваліся. У многім гэта было выклікана арыентацыяй усходнеславянскіх народаў і праваслаўнай царквы на візантыйскія культурна-рэлігійныя каштоўнасці, што вяло да змяншэння ролі царквы ў грамадскім жыцці ў параўнанні з заходнім светам. Праваслаўная царква не мела цэнтралізаванай арганізацыі, як гэта было характэрна для каталіцкай. Асабліва відавочна гэта праяўлялася падчас феадальнай раздробленасці на Русі. Важным фактарам было і татара-мангольскае іга, якое замарудзіла амаль на два стагоддзі культурнае развіццё славянскіх народаў. Падзенне Візантыйскай дзяржавы і прэтэнзіі Масквы на статус "трэцяга Рыма" падчас позняга сярэдневякоўя яшчэ больш замаруджвала паломніцкі рух. Характэрнай рысай для усходнеславянскіх паломнікаў было тое, што падарожжы часта былі абгрунтаваны не толькі рэлігійнымі прычынамі і мелі не чыста рэлігійную мэту, а былі звязаны з палітычнымі падзеямі і дынастычнымі праблемамі. Гэта відавочна выцякае з тэкстаў "хаджэнняў".Паломніцтва Данііла, напрыклад, прыходзіцца, пры гэтым не выпадкова, на час панавання крыжаносцаў у Палесціне, Ефрасіння адпраўляецца ў Іерусалім пад ціскам дынастычнай барацьбы, Графеній і Ігнацій у значнай ступені кіраваліся палітычнымі мэтамі. У выніку паломніцкі рух на беларускіх, рускіх і ўкраінскіх землях не набыў масавага характару, як гэта мела месца на Захадзе. Тым не менш, ён садзейнічаў захаванню больш-менш стабільных сувязяў паміж усходнеславянскімі народамі і традыцыйнымі цэнтрамі хрысціянскай рэлігіі і культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

---

[1] Bredero A. H. Christendom and Christianity in the Middle Ages. Michigan. 1994. P.138.
[2] Mertens A. Chronological walk through Bethlehem. Jerusalem, 1981. P.8.
[3] Малето Е.И. Хожения русских путешественников. XII – XV вв., М., 2000. С.33.
[4] Библиотека русского фольклора. Былины. М., 1988. Т.1 С.458-459.
[5] Там же. С.42.
[6] Заборов М.А. Крестоносцы и их походы на Восток XI – XIII века. М., 1962. С.123.
[7] Книга хождений. Записки русских путешественников XI – XV вв. М., 1984. С.31.
[8] История древнерусской литературы. М., 1976. С.56-67.
[9] Книга хождений. Записки русских путешественников XI – XV вв. М., 1984. С.73-74.
[10] Гаранін С. П. Шляхамі даўніх вандраванняў. Мн., 1999. С.37.
[11] Кніга жыцій і хаджэнняў. Мн., 1994. С.38.

[12] Гаранін С. П. Шляхамі даўніх вандраванняў. Мн., 1999. С.54.
[13] Там же. С.39
[14] Малето Е. И. Хожения русских путешественников. XII – XV вв. М., 2000. С.57.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ